Тарасава, Т.М. Сахарчук Васіль / Т.М. Тарасава // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы, Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А.В. Мальдзіса ; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Т. 5. – С. 263.

# САХАРЧУК ВАСІЛЬ



Сахарчук Васіль Якаўлевіч (н. 10.7.1953, в. Свадзьбічы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), паэт, перакладчык. Член СП Беларусі з 1988.

З сялян. У 1970 скончыў Павяціцкую сярэднюю школу Бярозаўскага р-на. У 1970—75 вучыўся на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта БДУ, пасля заканчэння якога накіраваны настаўнікам у Касцюкоўскую васьмігадовую школу Любанскага р-на Мінскай вобл. З 1977 да 1978 працаваў арганізатарам пазакласнай, пазашкольнай работы Обчынскай сярэдняй школы Любанскага р-на. У 1978 В. Сахарчук пераехаў у Брэсцкую вобл., дзе працаваў намеснікам дырэктара па выхаваўча-адукацыйнай рабоце Высокаўскай СШ Бярозаўскага р-на, адначасова выкладаў гісторыю. З 1979 жыве ў г. Жабінка Брэсцкай вобл., працуе ў рэдакцыі раённай газеты «Сельская праўда» загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі і адначасова кіруе літаратурным аб'яднаннем «Плынь».

Вершы В. Сахарчук пачаў пісаць яшчэ ў школе — падахвоціў яго да гэтага настаўнік беларускай літаратуры. Друкаваўся ў раённай газеце «Маяк коммунизма». Ва універсітэце працягваў пісаць вершы, друкаваўся ў калектыўным зборніку паэзіі «Універсітэт паэтычны» (1971), але сапраўдным пачаткам мэтанакіраванай літаратурнай працы лічыць 1979 год. Паэт дасылае свае вершы ў часопісы «Маладосць», «Беларусь», газету «Чырвоная змена», штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Першая нізка вершаў «Зорны мост» з'явілася ў калектыўным зборніку маладой паэзіі «Крыло» (1984), а ў 1988 выдадзены самастойны зборнік «Даніна». Паэзія В. Сахарчука працягвае традыцыі Ф. Багушэвіча і ў беларускім вершаскладанні. Паэт звяртае на сябе ўвагу глыбокай сацыяльнай думкай, філасофскім асэнсаваннем сучасных праблем, высокай паэтычнай культурай. Ён асвойвае такія формы верша, як верлібр, актава, тэрцын. Перакладае на беларускую мову вершы ўкраінскіх, рускіх і балгарскіх паэтаў. Сумесна з Н. Гілевічам пераклаў зборнік балгарскага паэта Пее Яварава «Апалавы пярсцёнак».

*Т. М. Тарасава.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ